# КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯЎ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**А. Я. Паўлава,** *канд. гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Сёння на Гомельшчыне поруч з традыцыйнымі музеямі гісторыка-краязнаўчага кірунку сярод 32 музейных установ дзейнічае 5 мастацкіх галерэй; 12 музеяў былі створаны ў перыяд 1991–2011 г. [11]. Акрамя традыцыйных музеяў гісторыка-краязнаўчага кірунку, мастацкіх галерэй, працуюць музей-лабараторыя спартыўнай славы, музей гісторыі асветы Гомельшчыны, музей крыміналістыкі, музей энергазберажэння [5; 7; 8 ]. Ёсць задумкі па стварэнні музеяў у аграгарадках. Прагучалі прапановы стварыць музей сялянскага побыту і рамёслаў, які б функцыянаваў як адзіная ўстанова з аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу. У 2012 г. па ініцыятыве гомельскай мэрыі ў горадзе адчыніць дзверы Музей фатаграфіі [1]. Музеі вобласці актыўна супрацоўнічаюць з іншымі музеямі краіны і замежжа, у прыватнасці Расіі [9].

На працягу апошніх 5 гадоў колькасць наведвальнікаў у музеях Гомельскай вобласці павялічылася ў 2 разы [11]. З гэтай нагоды ўяўляецца цікавым азнаёміцца з рэжымам працы музеяў. З прыгаданых 32 музейных установ вобласці 20 працуюць як мінімум у адзін з выхадных дзён (напрыклад, Ельскі краязнаўчы, Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музеі працуюць у суботу; 9 музеяў працуюць без выхадных дзён, у прыватнасці Калінкавіцкі дзяржаўны краязнаўчы музей). Тыя ўстановы, што зачынены ў выхадныя дні, аўтаматычна знікаюць з поля зроку сямейных наведвальнікаў, а таксама з маршрутаў экскурсій, якія адбываюцца ў суботу і нядзелю. Акрамя таго, у адрозненне ад іншых устаноў культуры большасць музеяў працуюць з 9:00 да 17:30 ці 18:00, калі дарослае насельніцтва занята на працы [9]. Такі рэжым робіць музеі даступнымі ў будні толькі для школьнікаў і пенсіянераў. Гэты падыход сведчыць аб тым, што музейныя ўстановы пакуль не ўяўляюць сябе актыўнымі суб'ектамі на рынку культурных паслуг і не паказваюць ініцыятывы, каб заняць належнае месца ў структуры вольнага часу жыхароў горада. Таму адным з неабходных умоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паляпшэння культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў павінен стаць перагляд рэжыму працы музейных устаноў.

Датычна дзейнасці па пашырэнні музейнай аўдыторыі адзначым наступнае. Музеі Гомельшчыны спрабуюць прыцягнуць больш наведвальнікаў пэўных узроставых і сацыяльных катэгорый. Так, у 2011 г. у Міжнародны дзень пажылых людзей, 1 кастрычніка, пенсіянеры мелі магчымасць наведаць музеі вобласці бясплатна. У межах праекта «Пажылыя людзі – залаты фонд грамадства» Гомельскім палацава-паркавым комплексам разам з гомельскім аб'яднаннем «Сацыяльныя праекты» на тэрыторыі гарадскога парка каля Лебядзінай сажалкі з кастрычніка 2011 г. арганізавана правядзенне ранішняй гімнастыкі для гэтай катэгорыі насельніцтва. Палацава-паркавы ансамбль разам з «Сацыяльнымі праектамі» і Жлобінскім гісторыка-краязнаўчым музеем яшчэ ў маі ў межах праграмы «Новае жыццё ў трэцім узросце» арганізавалі паездку пажылых людзей і інвалідаў г.Гомеля ў комплекс, прысвечаны дзецям – ахвярам вайны, што ў в.Чырвоны Бераг. У ліпені 2011 г. палацава-паркавы комплекс арганізаваў у сваіх залах культурна-асветную сустрэчу для пажылых людзей [ 6 ].

Для дзяцей той жа музей напярэдадні Міжнароднага дня гумару распачаў праект «Крывыя люстэркі» – выставу «Пакоі смеху» з адначасовым конкурсам малюнка «Як я пабываў па той бок люстэрка». Для пашырэння супрацоўніцтва з экалагічнымі рухамі музей браў удзел у «Маршы паркаў» – грамадскай акцыі па пасадцы саджанцаў; супрацоўнікі ладзілі для дзяцей конкурсы малюнкаў «Палацава-паркавы ансамбль» і на экалагічную тэматыку. Такім чынам, музейшчыкі могуць пашырыць сваю аўдыторыю сродкамі супрацоўніцтва з грамадскімі рухамі. Акрамя таго, палацава-паркавым ансамблем распрацаваны і ажжыцяўляецца варты ўвагі адукацыйны праект «Праз культуру і мастацтва ў жыццё» – па сацыяльна-культурнай рэабілітацыі і рэінтэграцыі ў грамадства дзяцей – інвалідаў па зроку [ 6 ].

Немалаважнае месца ў святле культурна-адукацыйнай дзейнасці займае сайт «Музеі Гомельшчыны», які быў створаны ў 2007 г. На сайце прадстаўлена інфармацыя аб гісторыі, калекцыях, рэжыме работы, культурна-асветнай і навуковай дзейнасці музейных устаноў. Шэраг музеяў, а менавіта Рагачоўскі, Калінкавіцкі, Лоеўскі і інш., прадставілі на сваіх старонках сайта бібліяграфічныя падборкі па гісторыі краю.
З сайта можна даведацца аб дзеючых і будучых музейных праектах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і выставах, што спрыяе павелічэнню колькасці наведвальнікаў [9]. Паступова музеі пачынаюць ствараць не толькі свае сайты, а і адначасова ладзіць перспектыўныя міжнародныя інтэрнэт-праекты. Так, гомельская Галерэя Г. Вашчанкі ў лістападзе 2011 г. сумесна з мюнхенскай гарадской выставачнай залай «Латрынгер 13» правяла «круглы стол» і прэзентацыю праекта «Арткуратар». Сумеснымі намаганнямі гомельскіх і нямецкіх музейшчыкаў створаны сайт «Аб сучасным мастацтве і тых, хто яго стварае». Мэта праекта – прадставіць усім зацікаўленым асобам, на рускай, нямецкай і англійскай мовах, інфармацыю аб тэндэнцыях у развіцці сучаснага беларускага і еўрапейскага мастацтва [2; 3].

Сярод фактараў, якія перашкаджаюць развіццю новых форм культурна-асветнай дзейнасці музеяў рэгіёна, можна назваць недастатковую падрыхтоўку музейных спецыялістаў, таму што профільная адукацыя, нават гістарычная, мастацкая ці філалагічная, не прадугледжвае навучанне актыўным тэатралізаваным формам сацыякультурнай дзейнасці, іх прымяненню на практыцы і зацікаўленасці супрацоўнікаў. Вельмі часта складаныя ўмовы існавання музеяў у непрыстасаваных памяшканнях ці няпэўная будучыня, як, напрыклад, у Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея, таксама не дазваляюць актыўна займацца распрацоўкай сучасных форм музейнай паслугі: недахоп плошчаў не дазваляе размясціць нават простую лекцыйную залу ці стварыць новую экспазіцыю. Далёка не ўсе музеі Гомельшчыны забяспечаны сучасным тэхнічным абсталяваннем. Аднак тыя з музеяў, якія здолелі набыць сучасную тэхніку, актыўна выкарыстоўваюць мультымедыя тэхналогіі ў асветных мэтах (Гомель, Рагачоў, Буда-Кашалёва і інш.).

Сярод відаў культурна-адукацыйнай дзейнасці на тэрыторыі музеяў можна выдзеліць традыцыйныя і перспектыўныя. Да традыцыйных, якімі карыстаюцца ўсе музеі, трэба аднесці экскурсіі, лекцыі, тэматычныя урокі, выязныя выставы, сустрэчы з вядомымі людзьмі, вахты памяці, вусныя часопісы; да перспектыўных – тэатралізаваныя святы, ноч музеяў, музычны салон, турыстычныя паслугі, музейныя заняткі і праграмы для рознага ўзросту, майстар-класы, выставы прафарыентацыйнага кірунку, удзел у грамадскіх акцыях, стварэнне віртуальных музеяў (напрыклад, музей знакамітых ураджэнцаў Гомельшчыны, створаны абласной бібліятэкай; музей гульні і цацкі сярэдняй школы № 63 г. Гомеля) [7; 13].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музеі Гомельшчыны робяць паспяховыя спробы развіцця турыстычных паслуг. Так, з 2004 г. існуе праект «Залатое кальцо Гомельшчыны», у якое ўключаны сам Гомель, Мазыр, Ветка, Лоеў, Рэчыца і Тураў. З 2008 г. дзейнічае і «Малое залатое кальцо Гомельшчыны». У межах гэтага праекта прадугледжаны экскурсійныя паездкі тэрмінам ад 1 да 3 дзён [4; 6]. Трэба адзначыць, што экскурсійныя паслугі аказваюць не толькі музеі г.Гомеля, а і ўстановы Мазыра, Лоева, Рагачова, Калінкавічаў, Рэчыцы, Жлобіна [9]. З мэтай папулярызацыі сваёй дзейнасці музеі Гомеля арганізавалі ў красавіку 2011 г. Фэст экскурсаводаў. Падчас прыгаданай акцыі супрацоўнікі музеяў і краязнаўцы праводзілі бясплатныя экскурсіі для жыхароў [6].

Зразумела, што музеі, якія знаходзяцца ў Чарнобыльскай зоне, па сутнасці, выключаны з турыстычнай сферы. Да прыкладу, Веткаўскі і Тураўскі размешчаны на багатых этнаграфічных тэрыторыях, аднак не ўключаюць экскурсіі ў сваю дзейнасць.

У дачыненні да экскурсій, па выніках анкетавання і гутарак з супрацоўнікамі, можна адзначыць: амаль не прадуманы экскурсійныя маршруты для розных катэгорый наведвальнікаў; значная доля аднолькавых па напаўненні экскурсій для дзяцей рознага ўзросту, сямейных наведвальнікаў, турыстаў і мясцовых жыхароў, а таксама шаблонны падыход пры стварэнні экспазіцый. Адсутнасць актыўнага камплектавання экспазіцыі новымі прадметамі мае следствам тое, што традыцыйныя аглядныя і нават тэматычныя экскурсіі становяцца нуднымі, непрывабнымі і бесперспектыўнымі.

Цікавыя прыклады стварэння выстаў на базе сваіх фондаў, як правіла, звязаны з удалым выбарам тэмы, якая б моцна прываблівала людзей. Так, у Рагачове штогод ладзіцца выстава «Лепшыя знаходкі мінулага года»; у Цэнтры гісторыі і культуры г.п. Акцябрскі рыхтуюць выставы «Людскія страхі і забабоны».

Сярод прывазных выстаў найбольшы поспех у наведвальнікаў маюць і могуць быць аднесены да перпектыўных наступныя: выставы краіназнаўчыя, прысвечаныя як краінам далёкага замежжа, так і краінам СНД ці прысвечаныя відам мастацтва, якія вядомы шырокім колам грамадства (фотавыставы, ікебана, бісерапляценне і г.д.); выставы, якія распавядаюць пра засваенне чалавекам новых прастораў і прыроду (напрыклад, асваенне космасу, сусветныя падарожжы, выставы ракавін і г.д.). У 2011 г. Гомель з’яўляўся культурнай сталіцай СНД. Музеі актыўна выкарысталі гэты факт.У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеях горада прайшоў шэраг выстаў з гэтай нагоды. Так, у Музеі гісторыі горада Гомеля восенню адбылася выстава прызавых работ міжнароднага дзіцячага конкурсу малюнка «Мы жывём у СНД». Удзельнічалі музеі Гомельшчыны і ў пашырэнні руху гарадоў-пабрацімаў. У лістападзе 2011 г. Гомельскі палацава-паркавы ансамбль ладзіў фотавыставу для жыхароў г.Клермон-Ферана, Францыя. У будучым французы прывязуць у Гомель аналагічную выставу [6].

Тэматычныя лекцыі і ўрокі традыцыйна прысвечаны краязнаўству (напрыклад, «Развіццё медыцынскіх устаноў Добрушскага раёна ў 1920-я гады», «Наш раён у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Знакамітыя ўраджэнцы раёна», «Скарбы Рагачоўшчыны», «Азарыцкі лагер смерці», «Гісторыя пажарнай службы на Рагачоўшчыне», «Пахавальныя звычаі людзей эпохі бронзы»). Вахты памяці прысвечаны ўраджэнцам Гомельшчыны – героям Вялікай Айчыннай вайны і воінам-інтэрнацыяналістам [9].

Традыцыйнай і адначасова перспектыўнай з’яўляецца публікатарская дзейнасць музеяў. Так, у «Гомельскай праўдзе» са студзеня 2011 г. адкрыта пастаянная рубрыка «Музеі Гомельшчыны», прызваная пашыраць сярод насельніцтва звесткі аб мясцовых музейных установах, іх дзейнасці, падахвочваць наведаць музей у вольны час.

Сярод перпектыўных і запатрабаваных грамадствам форм музейнай дзейнасці можна назваць стварэнне выстаў – прэзентацый прафесій. Так, у Цэнтры гісторыі і культуры г.п. Акцябрскі ў 2011 г. прайшлі выставы, прысвечаныя работнікам медыцыны і лясной гаспадаркі. Выставы суправаджаліся тэатралізаванымі і мультымедыйнымі прэзентацыямі прафесій. Падчас выставы-прэзентацыі, прысвечанай медработнікам, наведвальнікаў вучылі аказанню першай медыцынскай дапамогі. Адначасова былі праведзены конкурсы дзіцячага малюнка, прысвечаныя дзейнасці спецыялістаў галін медыцыны і аховы лесу.

Тэатралізацыя музейнай дзейнасці сёння адбываецца паўсюдна. Гэта, мабыць, самы заманлівы сродак прывабіць у музей моладзь. Так, той жа вышэйназваны Цэнтр гісторыі і культуры праводзіць тэатралізаваныя святы Каляды, Новы год, Дзень Перамогі, Купалле.

Яшчэ адной з сучасных форм музейнай актыўнасці з’яўляюцца музейныя заняткі. Напрыклад, Цэнтр гісторыі і культуры г.п. Акцябрскі ладзіць музейныя заняткі для школьнікаў і дашкольнікаў, прысвечаныя традыцыйнаму сялянскаму побыту. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогу запрашаюцца жыхары сталага ўзросту, якія вучаць дзяўчат прадзенню, ткацтву і г. д. Той жа Цэнтр ладзіць заняткі «Свята хлеба», падчас якіх не толькі распавядаецца пра працэс вырошчвання хлеба, але дзяцей вучаць выпякаць хлеб у сапраўднай печы. Завяршаецца занятак частаваннем усіх удзельнікаў свежым хлебам. Рагачоўскі музей народнай славы распрацаваў праграму музейных заняткаў для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Сярод тэмаў – самыя розныя: «Неба і зямля ў касцюме чалавека» (музейныя заняткі на гэтую тэму ладзіць і Веткаўскі музей), «Як людзі жылі раней», «Знаёмства з музеем», «Ці заўсёды рэчы былі такімі, як зараз», «Гісторыя хлеба» [9].

Заслугоўвае ўвагі праграма «Школа “Аз-букі-ведзі – глаголь дабро”», якая дзейнічае ўжо больш як 10 гадоў у Веткаўскім музеі народнай творчасці. Дзеці самой Веткі наведваюць музей бясплатна, дзякуючы гэтаму праекту. Прыгаданая школа традыцыйнай культуры разлічана на 12-гадовы тэрмін навучання (займаюцца дзеці і падлеткі ад 5 да 17 гадоў). Заняткі праводзяцца ў форме гульні ў спецыяльнай зале ці ў залах музея. За час існавання гэтага праекта быў выдадзены шэраг метадычных рэкамендацый па вывучэнні з дзецьмі традыцыйнай культуры і кніжка-маляванка «Веткаўская буквіца» [9].

Як ужо згадвалася, вялікую папулярнасць набываюць музейныя святы з удзелам мясцовых творчых калектываў. Часцей за ўсё такія праекты ладзяцца да самых папулярных у грамадстве святаў. Так, у Цэнтры гісторыі і культуры г.п. Акцябрскі штогадовымі сталі святы «Святое Раство – усім людзям хараство» (у час правядзення гэтага свята традыцыйна адбываецца прадстаўленне батлейкі), «Дзень Перамогі», «Купалле».

Цягам апошніх гадоў і беларускія музеі актыўна далучыліся да акцыі «Ноч музеяў». Так, у 2011 г. цікавую культурна-забаўляльную праграму прадставіў гамяльчанам і гасцям горада палац Румянцавых-Паскевічаў. У палацы і парку адбываліся канцэрты, спектаклі, перформансы, выставы, экскурсіі, майстар-класы, гістарычныя рэканструкцыі і дабрачынны аўкцыён. Найбольш прывабнымі сталі гістарычная реканструкцыя падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны і Сярэднявечча «Лагер ваенны». Перад публікай прадсталі людзі, апранутыя ва ўнікальныя касцюмы ваеннага часу, дэманстраваліся матацыклы і аўтамабілі 1940-х гг., разварнулася экспазіцыя «Сярэднявечныя рамёствы». Не менш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цікавымі ўспрымаліся трансляцыя (з дапамогай відэапраектара на сцяну палаца) відэаролікаў «Музеі свету», выступленні лаўрэатаў розных конкурсаў на сцэне Белай гасцёўні палаца Румянцавых-Паскевічаў і прэзентацыі трох новых выставачных праектаў [6].

Для параўнання: у невялікім музеі, Карцінная галерэі Л. Н. Дробава, у 2011 г. у ноч музеяў была арганізавана касцюміраваная вечарына дзіцячых страшылак.

Усё большую папулярнасць набывае арганізацыя музычных мерапрыемстваў у музеях. Так, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль арганізаваў музычны салон [6]; музейныя гасцёўні пачалі ствараца і ў невялікіх музеях (да прыкладу, музейная гасцёўня адчыніла свае дзверы ў Хойніцкім краязнаўчым музеі пасля яго рэканструкцыі) [14].

Да цікавых культурна-асветных падыходаў можна аднесці праекты, у якіх спалучаюцца выяўленчае мастацтва і літаратурная творчасць. Прыкладам такога супрацоўніцтва мастакоў і паэтаў служыць праект «Дыялог пяра і кісці», які аб'яднаў у адной выставе творчасць М.Дубровы і А.Каляды. Праект паспяхова дэманстраваўся у Ельскім, Жыткавіцкім, Калінкавіцкім, Акцябрскім, Лельчыцкім, Мазырскім, Нараўлянскім і Петрыкаўскім музеях [12 ].

Такім чынам, вышэйпрыведзеныя прыклады сведчаць, што пры адпаведнай музейна-камунікатыўнай афарбоўцы маюць будучыню і традыцыйныя музейныя формы культурна-асветнай работы: выставы, лекцыі, экскурсіі, публікатарская дзейнасць. Найбольш перспектыўнымі і прывабнымі формамі з'яўляюцца музейныя праекты з элементамі тэатральнага, канцэртнага ці святочнага відовішча, інтэрнэт-праекты, выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій і музейныя заняткі для дзяцей і падлеткаў.

1. *TUT.BY:* [Інфармацыйны партал]. – Рэжым доступу: http:/www. news.tut.by/culture/233688. – Дата доступу: 20.10.2011.

2. *Арткуратор:* [Сайт]. – Рэжым доступу: www.artkurator.com. – Дата доступу: 21.10.2011.

3. *БелаПАН*: [Сайт]. Рэжым доступу: http:/belapan.by/archive/ 2011/11/20/511382. – Дата доступу: 10.11.2011.

4. *Гомель* і Гомельская вобласць: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:// www.gomel109.com. – Дата доступу: 15.10.2011.

5. *Гомельскі* дзяржаўны ўніверсітэт: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:// www.gsu.by/chairs/muzej/. – Дата доступу: 9.11.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Гомельскі* палацава-паркавы ансамбль: [Сайт]. – Рэжым доступу: http: // www.palacegomel.by.

*7. Живой* Гомель: [Сайт]. – Рэжым доступу: http://www.livegomel. com. – Дата доступу: 20.10.2011.

*8. Золотое* кольцо Гомельщины: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:// goldring.gomel-region.by/. – Дата доступу: 22.10.2011.

*9. Музеі* Гомельшчыны: [Сайт]. – Рэжым доступу: http: //www/ museum.gomel-region.by/list. – Дата доступу: 20.10.2011.

*10. СТВ*. – Рэжым доступу: http:/www.ctv.by/node/36536/.

*11. Сэрвіс* навін Get-Newz: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:|//get. newz.com/society/25504-muzei-gomelskojj-oblasti-v-janvare.html. – Дата доступу:22.10.2011.

*12. ТРК* «Тэлевід»: [Сайт]. – Рэжым доступу: http://televid.by/ archives/2070. – Дата доступу: 11.11.2011.

*13. УА* СШ № 63 г. Гомеля: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:// www.nosh-63.gomel.by. – Дата доступу: 20.11.2011.

*14. Хойніцкі* райвыканкам Гомельскай вобласці: [Сайт]. – Рэжым доступу: http:/www.khoiniki.gomel-region.by/ru/society/culture/rajmuzej. – Дата доступу: 12.11.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ